1931
14 г. Прол. Револ.
Чэрвень
ИЮНЬ
ІЮН
30
ВТОРНИК
1864. Чтение на Мытнинской пл. в Петербурге приговора Н. Г. Чернышевскому (каторжн. раб. на 7 лет и вечная ссылка в Сибирь)
30 дней
Чэрвень
1918. Декрет о национализ. крупной промышл. и торговли.
Аўторак
III ТРЕТИЙ ДЕНЬ ПЯТИДНЕВКИ III
— 181 Ленинград. Ф-ка „Светоч“. + 185

Заўтра пачынаецца трэці квартал трэцяга рашаючага

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 908.
ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.
Кошт асобнага №—2 кап.

№ 149 (1418) АЎТОРАК, 30 чэрвеня 1931 г.

ЗДАРОЎ, ТРЭЦІ КВАРТАЛ РАШАЮЧАГА!

Заўтра першае ліпеня. Заўтра пачынаецца другая палова трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Заўтра прамысловасьць Савецкай Беларусі, як і ўсяго Саюзу, прыступіць да выкананьня кантрольных лічбаў 3-га кварталу.

Задачы і пэрспэктывы 3-га рашаючага году пяцігодкі ператварыліся ў мэту, у штандар, пад якім пролетарыят Савецкага Саюзу, пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі, перамагаючы ўсе цяжкасьці соцыялістычнага будаўніцтва, пасьпяхова будуе соцыялістычную грамаду і ў гэтым годзе завяршае фундамэнт соцыялістычнай экономікі.

Лічбы 3-га рашаючага сталі знаёмымі ўсім працоўным. Яны знаёмы і ворагам пролетарскай дыктатуры. Гэтыя лічбы—не пляны і габінэтныя разьлікі, гэтыя лічбы—конкрэтныя справы, жывыя сьведкі нашых перамог.

518 новых гігантаў соцыялістычнай індустрыі з кожным днём становяцца рэальнасьцю. 1040 машына-трактарных станцый пакрываюць магутнымі калёнамі трактароў неабдымныя прасторы колгасных палёў. 7 з паловай мільёнаў тон чыгуна адліваюць домны савецкай мэталюргіі. 74 з паловай мільёны тон вугалю здабываюць сёлета шахты Савецкага саюзу. На два з паловай мільярды руб. выпускаецца новых машын для 518. На 845 млн. руб. выпускаецца машын і на 745 тыс. конскіх сіл новых трактароў для 1040 машына-трактарных станцый.

Гэта не толькі лічбы, гэта не толькі разьлікі. Гэта рэчаіснасьць, гэта жывыя справы, бо ўжо далёка чуваць гул першых з 1040 і гудкі першачарговых 518.

Заўтра пачынаецца другое паўгодзьдзе. Мы пераступаем у другую паласу барацьбы за выкананьне народна-гаспадарчага пляну 3-га году пяцігодкі.

3-ці квартал рашае. Ад посьпехаў 3-га кварталу будзе залежаць выкананьне пляну 4-га кварталу і ўсяго гадавога. 3-ці рашае, бо на працягу гэтага часу павінны быць скончаны начатыя будоўлі і ўвайсьці ў строй працуючых гігантаў. 3-ці рашае, бо гэты час зьяўляецца часам падрыхтоўкі да асеньне-зімовых перавозак і правядзеньня ўборачнай кампаніі. 3-ці рашае, бо за гэты час павінен увайсьці рад прадпрыемстваў, ад працы якіх будзе залежаць далейшае будаўніцтва 518.

Трэці квартал патрабуе асаблівай запружанасьці, асаблівай опэрацыйнасьці ва ўсёй рабоце грамадзкіх організацый і комсамолу.

Ніякія об'ектыўныя прычыны, ніякія цяжкасьці ня змогуць паслужыць апраўданьнем для тых, хто не перабудуе сваю работу, увесь свой апарат, усе свае мускулы на справу выкананьня плянаў трэцяга кварталу.

Уся работа комсамольскай організацыі павінна быць прыстасавана да ўмоў барацьбы за выкананьне тых грандыёзных задач, якія пастаўлены перад комсамолам ў гэты пэрыод, бо трэці квартал будзе экзаменам, баявой праверкаю таго, наколькі комсамол здолеў паглыбіць зьдзейсьнены ў асноўным да IX-га зьезду УсеЛКСМ і X-га зьезду ЛКСМБ паварот тварам да вытворчасьці наколькі ўся праца комсамолу прыстасавана да асноўнай задачы: выканаць пяцігадовы плян у найкарацейшы тэрмін.

Асаблівую ўвагу комсамольская організацыя павінна зьвярнуць на ўкараненьне гаспадарчага разрахунку. Гаспадарчы разрахунак зьяўляецца вядучай прадпасылкай для поўнага выкананьня вызначаных плянаў. У бліжэйшыя дні неабходна паставіць задачу: ніводнай комсамольскай ударнай брыгады, ніводнай вытворчай комуны, агрэгата, або істужкі, не пераведзеных на гаспадарчы разрахунак.

Пытаньні плянаваньня організацыі, унутрызаводзкага плянаваньня таксама адыгрываюць ня меней важную ролю. Неабходна дабіцца, каб пляна-опэрацыйныя групы на прадпрыемствах былі памножаны на дзесяткі новых груп, якія-б забясьпечылі якаснае выкананьне паказчыкаў прамфінпляну, поўнае зьніжэньне сабекошту продукцыі і павышэньне яе якасьці.

Прыклад комсамольскай комуны імя „Чырвонай Зьмены“ заводу Варашылава павінен стаць прыкладам таго, як неабходна організоўваць работу і змагацца з прарывамі, бо гэта яскравае злучэньне бальшавіцкіх тэмпаў з узорнай якасьцю.

3-ці квартал павінен даць значнае выкананьне плянаў мобілізацыі сродкаў і ліквідацыі прарываў у гэтай галіне. За час 3-га кварталу трэба дабіцца поўнай рэалізацыі пазыкі як у горадзе, так і на вёсцы. Усе вольныя сродкі, усе магчымасьці накіраваць у адно рэчышча, да аднае мэты—выкананьня плянаў 3-га кварталу.

Уся работа павінна быць цесна ўвязана з ростам комсамолу, з барацьбою за ператварэньне яго ў шматмільённы баявы атрад барацьбітоў на фронце гаспадарчага перакопу.

Гудкі 518-ці клічуць. З поўнай падрыхтаванасьцю, адмятаючы з дарогі ўсіх малавераў, правых опортуністых і „левых“ загібшчыкаў, пад кіраўніцтвам партыі Леніна, сустрэнем другое паўгодзьдзе падрыхтаванымі.

Здароў,—трэці квартал, трэцяга рашаючага!

Забясьпечыць фінансаваньне 518 і 1040

Дамо падмацаваньне дням рашаючага

Трэці квартал трэцяга, рашаючага павінен быць забясьпечаны моцнай фінансавай базай

З ПЕРАМОГАЙ, ТАВАРЫШЫ!

Баявому атраду ЛКСМБ Гомельскай комсамольскай організацыі, якая спаборнічае з Менскай комсамоліяй, ад актыву гарадзкой організацыі—баявое комсамольскае прывітаньне. Прыклад Гомельскай організацыі зьяўляецца буксірам для ўсіх тых, хто да гэтага часу адстае у барацьбе за выкананьне вызначаных партыяй задач, за выкананьне плянаў 3-га рашаючага.

Таварышы з Гомеля!

Ваш выклік Менскай комсамоліяй пачуты. У адказ на яго мы абвяшчаем баявую трывогу з тым, каб да пленуму ЦК КП(б)Б прыйсьці з поўнай рэалізацыяй пазыкі і ліквідацыяй прарываў.

Пабудова 518 і 1040 падмацаваньне атрымае.

На ваш выклік мы адкажам поўным выкананьнем вызначаных плянаў. Да новых перамог таварышы!

(Прынята аднагалосна на агульна-гарадзкім сходзе актыву)

З уздымам праходзіць падпіска ў колгасах

ЛЕПЕЛЬ, 29. (БЕЛТА). Началася падпіска на пазыку „3-ці рашаючы“ у колгасах. Падпіска праходзіць з вялікім уздымам.

Колгасьнікі „Зарава“ падпісаліся на паўмесячны заработак і выклікалі на спаборніцтва колгас „Чырвоны Лепель“. Колгасьнікі Чырвонага Лепеля, прыняўшы выклік, падпісваюцца на месячны заработак.

Рапарт

Менгаркому ЛКСМБ, „Чырвонай Зьмене“ і „Юнгер Арбэйтэр“.

Кантрольная лічба рэалізацыі пазыкі „3-га рашаючага году пяцігодкі“ па сыстэме Менрайпрамсаюзу складае 300 тысяч руб. Зараз праведзена падпіска на 360 тыс. р., што складае 120 проц.

Падпіска працягваецца.

Сэкратар колектыву Гіршык.

Пасты і дазоры даносяць

Падпіску на пазыку „3-га рашаючага“ школа Будвучу пры Белжылсаюзе перавыканала. Усяго падпіска дала 4030 руб., што складае звыш 100 проц. месячнай зарплаты.

Ляпецкі.

Комсамольская ячэйка будаўнічага аддзелу МЦРК поўнасьцю падпісалася на пазыку „3-га рашаючага“, у памеры месячнага заработку.

Паперна.

Комсамольская ячэйка заводу „Праца“, Жыткавіцкага раёну, па-бальшавіцку рэалізуе пазыку „3-га рашаючага“.

Ня гледзячы на пастанову агульнага сходу аб 100 проц. падпіскі на пазыку, большасьць комсамольцаў падпісаліся на 150-200 проц.

Галубіцкі.

ЗА ПОЎНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ФІНПЛЯНУ БССР

З артыкулу Народнага Камісара Фінансаў БССР
тав. Хацкевіча.

Паўгода ўжо прайшло з таго часу, як сьнежаньскі пленум ЦК УсеКП(б) з усёй яскравасьцю і катэгорычнасьцю ў шэраг важнейшых гаспадарча-палітычных задач паставіў пытаньне поўнага і сваячасовага выкананьня фінансавага пляну.

Паўгода—час дастатковы для таго, каб перабудаваць працу ў адпаведнасьці з пастаўленымі ў галіне фінансавага пляну задачамі.

Фактычныя вынікі выкананьня аднэй з важнейшых частак фінансавага пляну—пляну мобілізацыі сродкаў насельніцтва,—лепшы доказ таго, што дырэктывы партыі адносна строгага выкананьня фінансавага пляну не прасякнулі яшчэ практычнай работы ўсіх партыйных, савецкіх і ў першую чаргу, фінансавых органаў, гаспадарчых прадпрыемстваў і грамадзкіх організацый.

Плян асобнага кварталу 1930 г. быў выкананы на 88 проц., плян першага кварталу на 78 проц., плян другога кварталу на 20 чэрвеня выканан толькі на 62,5 проц.

Плян касавага паступленьня па рэалізацыі дзяржаўных пазык выканан на 20-VI толькі на 54,4 проц., па ашчаднай справе на 30 проц.

У гэтым сказваецца маючаяся запазычанасьць па праведзенай падпісцы па пазыку „Пяцігодка ў чатыры гады“ паслабленьне ў другім квартале работы па дадатковай рэалізацыі на вёсцы і амаль поўная адсутнасьць работы сярод сэзоньнікаў.

Яшчэ горш справілася з задачай выкананьня пляну вясковая сетка спажывецкай кооперацыі. Плян паенакапленьня на 20-VI выканан толькі на 42, 5 проц.

Зусім сарвана праца па распаўсюджваньню абавязацельстваў на сельска-гаспадарчыя машыны. Плян, які цалкам павінен быў быць выкананы ў другім квартале, на 20-VI выкананы толькі на 2,6 проц.

Зусім нездавальняюча выканан плян паступленьня прамысловага падатку (38,8 проц.) На мясцох гэта часта тлумачаць тым, што „прыватнік ужо ліквідаваны“ і няма з каго спаганяць гэты падатак. Гэткія разважаньні сьведчаць толькі аб клясавай сьлепаце няздольнасьці і нежаданьні, як сьлед прасачыць за скрытай дзейнасьцю прыватніка.

Вывад з гэтых лічбаў можа быць толькі адзін; справа мобілізацыі сродкаў насельніцтва не ператварылася яшчэ ў адну з важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній. Тыя раёны, якія сапраўды паставілі справу мобілізацыі сродкаў у шэраг важнейшых пытаньняў, дабіліся і належных вынікаў. Аршанскі раён, напрыклад, на 20 чэрвеня выканаў больш 80 проц. квартальнага пляну, Тураўскі, Мажанскі звыш 70 проц.

Яўна няправільнымі, небальшавіцкімі, опортуністычнымі зьяўляюцца спробы апраўдаць нявыкананьне пляну тым, што займацца справай мобілізацыі сродкаў перашкаджаюць іншыя кампаніі. Койтанаўскі раён передавы па калектывізацыі і па мобілізацыі сродкаў. Лепельскі раён дасягнуў 72,9 проц. колектывізацыі і разам з гэтым лепш другіх выконвае пляны мобілізацыі сродкаў.

Ня выконваць фінансавага пляну—гэта значыць тармазіць пасьпяховае разгортваньне соцыялістычнага наступу.

Фінансава-крэдытны апарат у першую чаргу павінен усьвядоміць тую адказнасьць, якая ляжыць на ім на сучасным этапе соцыялістычнага будаўніцтва, уразумець і адпаведным чынам пабудаваць сваю працу. Нездавальняючае становішча паасобных зьвеньняў фінансава-крэдытнага апарату, ігнараваньне соцыялістычных форм і мэтадаў барацьбы за выкананьне пляну соцспаборніцтва і ўдарніцтва, баязьнь мас, няздольнасьць мобілізаваць узрослую актыўнасьць мас на вырашэньне фінансавых задач—гэта застарэлая хвароба, ад якой ня вылячыўся яшчэ фінансава-крэдытны апарат. Усе гэтыя буйнейшыя недахопы работы фінансавага апарату зьяўляюцца не апошняй прычынай тых прарываў, якія мы маем у галіне фінансавага пляну.

Аднак было-б няправільным гэтыя прарывы тлумачыць толькі недахопамі работы фінансавага апарату, які к таму-ж ва многіх сваіх зьвеньнях, асабліва на вёсцы, зьяўляецца, пакуль што, надзвычайна слабым. Калі пытаньнем організацыі мас на вырашэньне фінансавых задач не фармальна, а сапраўды і конкрэтна займуцца профэсыйныя, комсамольскія і ўсе іншыя грамадзкія організацыі—толькі ў гэтым выпадку мы можам разьлічваць на пасьпяховае і поўнае выкананьне фінансавага пляну.

Мобілізацыя сродкаў вёскі мае выключна важнае значэньне. Сельскі савет, яго фінансавая работа—цэнтральны пункт у гэтым пытаньні. Ня толькі вясковы актыў і вясковая грамадзкасьць ня былі мобілізаваны на выкананьне конкрэтных плянавых заданьняў, а нават сам сельсавет нярэдка забываў аб гэтым пляне.

Бюджэт—гэта фінансавы плян гаспадарчай дзейнасьці. Забясьпечыць актыўны ўдзел шырокіх мас ў справе выкананьня бюджэту—значыць забясьпечыць іх удзел у соцыялістычным будаўніцтве, значыць азнаёміць іх з посьпехамі і цяжкасьцямі гэтага будаўніцтва.

Мы падыходзім да канца другога кварталу, праводзячы ўдарны дэкаднік ліквідацыі прарываў на фінансавым фронце.

За гэтым дэкаднікам пачнецца новы трэці квартал з новымі, яшчэ большымі задачамі. 3-ці квартал рашае пытаньне выкананьня ўсяго гадавога пляну.


Дзеля сур'ёзнага і поўнага выкананьня фінпляну ў БССР неабходна узмацніць масавую работу сярод рабочых і сялянскіх мас гораду і вёскі, растлумачваючы палітычнае і гаспадарчае значэньне поўнага і сваячасовага выкананьня фінпляну і ў першую чаргу пляну мобілізацыі сродкаў насельніцтва.

Тэмпы рашаюць справу. Таму трэба перайсьці ў 3-ці квартал на ударнай хвалі апошняй ударнай дэкады другога кварталу—у гэтым галоўная задача сучаснага моманту.

У 3-м рашаючым квартале неабходна распаўсюдзіць новую пазыку пяцігодкі, пакрыць недавыкананьне пляну першай паловы году і ў другую палову году БССР павінна ўвайсьці з такімі вынікамі выкананьня фінансавага пляну, якія сьведчылі-б аб сапраўдным выкананьні дырэктыў партыі, аб сапраўдным узмацненьні фінансавай сыстэмы, аб ліквідацыі опортуністычна-самацёчных настрояў у справе выкананьня фінансавага пляну, аб строгім выкананьні гаспадарчых разьлікаў і фінансавага пляну.

Хацкевіч

Усе сілы мускулаў, прымусім трэцяму,



ЦК комсамолу—Гуткіну
„Чырвонай Зьмене“

ВЫКАНАЛІ ДАТЭРМІНОВА

(Па тэлеграфу). У зьвязку з падрыхтоўкай да кантрольнага пленуму ЦК ЛКСМБ, 26 чэрвеня, а 8 гадзіне раніцы—8-я ўдарная маладзёжная істужка Віцебскай швэйнай фабрыкі „Сьцяг індустрыялізацыі“ датэрмінова выканала прамфінплян першага паўгодзьдзя.

Істужка акомсамолена. У партыю перадана 12 чалавек.

Сэкратар колектыву ЛКСМБ—ЭПШТЭЙН.

Новая перамога „Бальшавіка“

Рапарт

рабочых, работніц інжынэрна-тэхнічнага пэрсоналу і служачых менскае чырвонаштандарнае гарбарні „Бальшавік“

На падставе захаваньня і далейшага ўзмацненьня дасягнутых заводам тэмпаў ва ўдарным квартале, мы датэрмінова закончылі програму прамфінпляну за першае паўгодзьдзе 1931 году, якая супроць першага паўгодзьдзя 1930 г. павышана на 22,81 проц. Колькасьць рабочых зьменшана на 2,3 проц. супроць пляну.

27-га чэрвеня мы выканалі прамфінплян у колькасных паказчыках на 100,8 проц., у цэнасных выразе—на 103,9 проц., заданьне па зьніжэньню сабекошту значна перавышана.

Нашы перамогі, якія мы атрымліваем з кварталу ў квартал, выклікалі некаторую супакоўнасьць сярод назначнай часткі нашых рабочых, што стварае небясьпеку асьлабленьня тэмпаў працы.

Але мы гэтага недапусьцім! Мы зараз разгортваем шырокую масавую кампанію па распрацоўцы сустрэчнага прамфінпляну на другое паўгодзьдзе 1931 году.

Мы яшчэ больш узмацнім барацьбу супроць усіх недахопаў у нашай працы і забясьпечым пасьпяховае выкананьне прамфінпляну другога паўгодзьдзя 3-га рашаючага году пяцігодкі, году скончаньня пабудовы фундаманту соцыялістычнай экономікі СССР.

(Прыняты на агульна-заводзкім мітынгу 27-га чэрвеня).

Комсамольскі цэх рапартуе

Комсамольская істужка, організаваная у пачатку ўдарнага кварталу, паказала на справе сваю здольнасьць змагацца за бальшавіцкія тэмпы ў выкананьні прамфінпляну.

За час другога кварталу комсамольская істужка ўвесь час перавыконвае прамфінплян з пакрыцьцём 15 проц. сустрэчнага на зьвішчэньне мінулага прарыву па ўсёй фабрыцы.

На плянавых заданьнях на другі квартал, комсамольскі цэх павінен быў штодзённа здаваць 625 каўняроў, а здаваў па 800 штук.

На апошнія два тыдні было заданьне ў 7500 каўняроў. Разгорнутым мэтодам соцспаборніцтва за 10 дзён мы выпрацавалі 8000 штук. 27-га чэрвеня, а 3 гадзіне дня, комсамольскі цэх давёў поўную рэальнасьць узятых бальшавіцкіх тэмпаў—выканаў прамфінплян другога кварталу.

На пазыку 3-га рашаючага году комсамольскі цэх даў 101 проц. месячнага заработку. У складзе комсамольскай істужкі 84 проц. ударнікаў.

Усе гэтыя дасягненьні ёсьць вынік згуртаванасьці вакол партколективу і бюро гаркому ЛКСМБ.

Зараз комсамольскі цэх бярэ на сябе абавязак у далейшым палепшыць якасьць продукцыі, уцягнуць астатніх рабочых ва ўдарныя брыгады, перадаць лепшых комсамольцаў ударнікаў у рады КП(б)Б.

Мы абавязваемся дапамагчы адстаючым цэхам, узяўшы іх на буксір, і адміністрацыі—перавесьці нашу істужку на гаспадарчы разрахунак.

Парторг—Капілевіч
Сэкратар ячэйкі ЛКСМБ Баброва
Профупаўнаважаны – Брохін.

Вопыт Менску—усяму ЛКСМБ

Менскі гарком ЛКСМБ дзесятага ліпеня падводзіць вынікі выкананьня комсамольскай організацыяй пастаноў зьездаў аб 100 проц. ахопе комсамольцаў і рабочае моладзі соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам, з пераключэньнем яго на вышэйшую ступень, у адпаведнасьці з задачамі 3-га, рашаючага году.

Праверка праводзіцца на наступных пытаньнях: выкананьне кожным комсамольцам прамфінпляну па ўсіх паказчыках, удзел комсамольцаў і рабочае моладзі ў рацыяналізацыі, плянаваньні, вытворчых прапановах. Значная ўвага ўдзеляецца пытаньням асваеньня тэхнікі, удзелу ў буксірах, скразных брыгадах, конвэеру якасьці і г. д.


Бюро гаркому прапанавала ячэйкам пры праверцы зьвярнуць асаблівую ўвагу да выкананьне фінпляну, разгарнуўшы масавую працу за поўны пераход паасобных брыгад і комун на гаспадарчы разрахунак, за 100 проц. ахоп моладзі і дарослых рабочых ашчадкасамі і выкананьне кантрольных лічбаў падпіскі на пазыку 3-га рашаючага.

Мэтод праверкі ўстаноўлены наступны: кожны комсамолец, беспартыйны малады рабочы на сходзе брыгады альбо комуны здае справаздачу ў тым, як ён выканаў пастанову зьезду аб 100 проц. ахопе ўсіх комсамольцаў і рабочае моладзі ўдарніцтвам.

Асаблівую ўвагу ячэйкі павінны зьвярнуць на выяўленьне ілжэўдарнікаў, выкрываючы іх як асноўных вінавайцаў зрыву плянаў 3-га рашаючага году.

Бюро гаркому прапанавала ячэйкам у час масавай праверкі ажывіць працу чырвоных дошак, комсамольскіх старонак у шматтыражках, дабіваючыся выкананьня лёзунгу: „кожны ўдарнік-рабкор—змагар за бальшавіцкія тэмпы“.

Усю гэтую працу трэба правесьці ўдарна, пры высокім уздыме політычнай актыўнасьці, масавым удзеле комсамольцаў і беспартыйнай моладзі



Работу клюбаў—на службу прамфінпляну

КУЛЬТРАБОТУ-НАСЛУЖБУ ПРАМФІНПЛЯНУ

Клюб, парк, дом соцыялістычнай культуры, нардом, хата-чытальня, ленінскі чырвоны куток, організаваны здаровы быт—усё гэта павінна быць прыстасавана да надвышаных патрэб 3-га, рашаючага кварталу, рашаючага году.

Клюб—на выкананьне плянаў рашаючага году

„Уся політыка-асьветная і культурная работа профсаюзаў павінна быць накіравана ў першую чаргу на разьвіцьцё соцыялістычна-сьвядомых адносін і дапамогі соцыялістычнай вытворчасьці“ (З рэзолюцыі 16 партзьезду аб задачах профсаюзаў). Прасякнуць політыка-клясавым зьместам работу клюбу, ні на хвіліну не запамятуючы аб мобілізацыі ўсіх сіл і магчымасьцяй унутраныя рэсурсы на барацьбу за выкананьне і перавыкананьне вытворчых і фінансавых плянаў, за пяцігодку ў 4 гады—такая устаноўка партыі у рабоце клюбаў.

Але нажаль, ня гледзячы на тое, што ў пытаньнях работы клюбаў, дамоў соцыялістычнай культуры, нардамоў, хат-чытальнь і г. д. існуе паўнейшая ясгасьць у пастаўленых перад імі задач, тэмпы культурна-бытавой работы далёка не пасьпяваюць за тэмпамі соцыялістычнага будаўніцтва.

Клюб—месца правядзеньня нарад і сходаў

У Беларусі вельмі часта сустракаемся з фактамі бязьдзейнасьці клюбаў, ператварэньня клюбаў з ачагоў культуры, цэнтру політычна масавай работы і месца адпачынку—у месца правядзеньня нарад, паседжаньняў і сходаў.

Нядаўна пабудаваны клюб для чыгуначнікаў у Гомелі мае шмат вялікіх і пекных пакояў, але ў гэтых пакоях акрамя нарад і сходаў ніякай працы не праводзіцца. Мізэрная бібліотэка і чытальня працуюць дрэнна.

Юнсэкцыі, як ударныя брыгады моладзі, ня існуюць.

„Твой взор нежной свирели“

Клюб будаўнікоў імя Халтурына (Гомель) у задачу якога уваходзіць забясьпечыць культурна-масавым абслугоўваньнем сэзоньнікаў, таксама не працуе. Час ад часу праводзяцца вечары. А на іх—вялікі сумотны даклад на агульную тэму і пастаноўка ці частушкі, якія ні ў якім разе не мобілізоўваюць увагу сэзоньнікаў на неабходнасьць хутчэйшага і лепшага скончаньня пабудовы.

Клюб Саўгандальслужачых таксама бязьдзейнічае. Толькі калі-небудзь праводзяцца вечары з такімі „злабадзённымі“ і „мобілізуючымі“ матар'яламі, як:

„..„Твой взор нежной свирели,
Твои глаза, как небо голубое..“

Да пленуму ЦК ЛКСМБ

„Нам усе нічым, мы усё можам“

У Буда-Кашалёўскі дом Соцыялістычнай культуры у зьвязку з тым, што там праходзіла настаўніцкая раённая конфэрэнцыя, былі запрошаны артыстыя (увесь час дом Соц. культуры не працаваў), якія „мобілізоўвалі“ настаўнікаў на актыўны ўдзел і дапамогу па сканчэньньні севу, організацыю колгасаў і ліквідацыю на аснове колектывізацыі кулацтва, як клясы такімі сьпевамі:

„...В два часа
Ликвидируем кулака“.

Ці ня, праўда, борзыя якія? „Нам ўсё нічым, мы ўсё можам!“ Замест таго каб даказаць сялянам і настаўнікам, што барацьба за організацыю колгасаў, за ліквідацыю кулацтва, ёсьць бязьлітасная клясавая барацьба, мобілізоўваць іх на гэтую штодзённую бязьлітасную барацьбу, артыстыя дэмобілізоўваюць.

І калі комсамольцу, загадчыку—дому соцыялістычнай культуры сказалі, што гэта рэч дрэнная, што рэч дэмобілізоўвае савецкую грамадзкасьць,—ён адказаў:

— Для Менску гэта не падыходзіць, а для Буда-Кашалеўскай і гэта добра.

„Няма дырэктыў—няма плянаў“

Ці трэба пасьля гэтых некалькіх фактаў з бясконцага ланцугу іх даказваць, што ў шмат якіх раёнах Беларусі пагаджацца ня толькі паўнейшая неадпаведнасьць задачам прад'яўляемыя клюбам на сучасным этапе соцыялістычнага будаўніцтва, з іх практычным ажыцьцяўленьнем, але і адсутнасьць навет мінімальнай работы па абслугоўваньню ударнікаў.

Важнейшай прычынай клюбнай няўрадзіцы зьяўляецца ў першую чаргу—адсутнасьць патрэбнага кіраўніцтва партыйна-комсамольскіх і асабліва профэсыянальных організацый, стаўка на абы-якія адносіны, стаўка на самацёк, якія пераважаюць да гэтага часу ў адносінах да клюбнай работы.

Падыдзеце да культпропу райкому комсамолу, колектыву, ячэйкі і запытайце:

— Які твой плян у адносінах разгортваньня культурна-бытавой работы ў клюбе?

Ня лічу, што ўсе, але значная большасьць культпропаў, такіх плянаў нямае.

— Няма дырэктыў—няма плянаў,—атрымаеце адказ.

Юнсэкцыя—ударная клюбная брыгада

Як бачна, клюб і ўдарная клюбная брыгада,—юнсэкцыя, павінны адыгрываць важнейшую ролю ў справе мобілізацыі савецкай грамадзкасьці на ажыцьцяўленьне вялізнай важнасьці задачы—выкананьне і перавыкананьне плянаў рашаючага году. Клюбы, і асабліва юнсэкцыі, да сёлешняга дня не павярнуліся шчыльна тварам да вытворчасьці, да задач, пастаўленых 3-м, рашаючым.


Неабходна зараз-жа, не чакаючы ні хвіліны, разгарнуць на аснове ўдарніцтва і соцспаборніцтва клюбную культурна-бытавую работу для лепшага і хутчэйшага выкананьня прамфінплянаў, для ліквідацыі прарываў у самой клюбнай рабоце.

Самадзейныя гурткі, групы зацейнікаў, ударнікаў-літаратараў, цэхавыя і брыгадныя культработнікі і інш. павінны быць мобілізаваны для наладжваньня клюбнай работы.

Комсамольскія організацыі павінны ўзяць шэфства над клюбамі, дамамі колектывістых, дамамі соцыялістычнай культуры, ленінскімі і чырвонымі куткамі, чытальнямі і наладзіць там, шляхам організацыі ўдарных брыгад, належную работу. Аб тым, як практычна паставіць культурна бытавую работу клюбу і масавікоў—культармейцаў,—у наступным артыкуле.

Цішка Верны.

Варштатаў і трансмісіі ударнаму служыць



У барацьбе за выкананьне прамфінпляну

Камсамольская арганізацыя Віцебскай фабрыкі „Сьцяг індустрыялізацыі“ дабілася вялікіх посьпехаў у галіне выкананьня прамфінпляну.

Першы квартал 3-га году пяцігодкі быў скончаны з вялікім прарывам, бо соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва аслаблі. Комсамол фабрыкі мобілізаваўся на ліквідацыю прарываў. Пасьля цэхавых зьлётаў маладых ударнікаў балючыя пытаньні абгаварваліся на іх агульна фабрычным зьлёце.

Вынікі? Май месяц даў выкананьне прамфінпляну на 126 проц. Комсамольцы паказалі тут сапраўды бальшавіцкія тэмпы.

Ударна працуюць на фабрыцы маладзёжныя істужкі і комсамольскі ўдарны вучастак. Восьмая маладзёжная ўдарная істужка замест 750 адзінак у дзень, выпускае 800—850. Яна сыстэматычна перавыконвае прамфінплян, яна цалкам перайшла на гаспадарчы разрахунак.

Другая маладзёжная істужка таксама паказала ўзорную работу. Там цяпер організавалася плянава-опэрацыйная група, якая рыхтуе пераход істужкі на гаспадарчы разрахунак. Маладзёжная істужка наставіла сабе задачу стаць комсамольскаю, уцягнуўшы рабочую моладзь у КСМ.

Комсамольскі закройны вучастак, які атрымаў пераходны сьцяг, таксама прыкладна організаваў работу. Раней гэты вучастак быў маладзёжным. К першаму мая ўся моладзь ўлілася ў рады комсамолу.

Неабходна вывучыць вопыт організацыі работы комсамоліяй фабрыкі „Сьцяг індустрыялізацыі“: як ад глыбокіх прарываў пераходзіць да поўнага выкананьня прамфінпляну, як змагацца ў трэцім квартале 3-га рашаючага.

Б. Зэліксон.

Цукеркавая фабрыка скончыла плян паўгодзьдзя

Магілёў, 29, (Белта) 24-га чэрвеня цукерьхавая фабрыка выканала прамфінплян другога паўгодзьдзя, выпусьціўшы 2 тоны продукцыі.

Сабекошт зьніжаны з 4,2 проц. па пляну, на 6 проц. Адчуваецца значнае паленшаньне якасьці продукцыі.

Аб ударнай чырвоназьменаўскай

Былая цэнтравальная брыгада няла выпуск варштатаў тэрміновай і баявой задачай.

Дэталі для зборкі прыбывалі з такарнага цэху бяз усякага вучоту. Брак кідаўся між варштатамі. Хапаліся за новыя дэталі. І так увесь час: навольна, хаотычна, злачынна.

Вынік ясны. У лютым брыгада выканала свой прамфінплян толькі на 28 проц.

Гэта ў той час, калі разгортвалася вялікая будоўля, калі заводы патрабавалі абсталяваньня, калі краіна перажывала вялікі машынны голад.

Зашумеў завод. Ускалыхнулася партыйная і комсамольская організацыя, ускалыхнулася ўся пролетарская грамадзкасьць. Хваля энтузіязму ахапіла завод. Выявіліся адзінкі з многіх комсамольцаў-ударнікаў: Гурэвіч і Ігнатоўскі.

Паставілі пытаньне аб прарывах цэнтравальнай брыгады на паседжаньні бюро колектыву. Адказваюць перад бюро Ігнатоўскі і Гурэвіч.

Адказ кароткі:

—У сакавіку ліквідуем лютаўскі прарыў.

Так заявілі комсамольцы Ігнатоўскі і Гурэвіч. Так заявілі бальшавікі.

У сакавіку брыгада пачала штурм прарыву. Перш-на-перш абвясьціла непрымірымую вайну ўсім унутрызаводзкім непаладкам, няправільнай расстаноўцы сіл. Самаахвярна змагалася за выкананьне вытворчага заданьня. За варштатам праводзіла дзесяць і больш гадзін, абы змыць ганебную пляму.

У гэтыя гарачыя дні і організавалася ўдарная комсамольская комуна.

А было гэта так:

Комсамольцы ўзяліся перш за ўсё высьветліць прычыны прарыву. У абедзены перапынак скліікаліся кароткія вытворчыя нарады,—абгаварвалі ўсе непаладкі вытворчасьці. Комсамольцы ўзялі пад свой кантроль дэталі, якія прыбываюць у цэх. Брыгада змагалася за 180% програмнага заданьня.

Не дарма на заводзкай чырвонай дошцы квітнелі прозьвішчы ўдарнікаў комсамольцаў: Грушко, Гурэвіча і Ігнатоўскага.

У красавіку „Чырвонай Зьмене“ мінула 10 год. Брыгада ў гонар юбілею рэорганізавалася ў комуну імя „Чырвонай Зьмены“. Так нарадзілася ўдарная чырвоназьменаўская.

Вылучылі савет з трох асоб. Загадчык гаспадарчай часткаю комуны прыходзіць штодня раніцою перад работай праверыць колькасьць прыбыўшых дэталяй. Ён кіруе ўсёй гаспадаркаю комуны. Без яго ведама ніхто ня мае права браць ніякае дэталі, бо брыгада ведае іх каштоўнасьць.

На кароткіх вытворчых нарадах комуны, пасьля працы абгаварваюць ак выкананы пляны сёньняшняга дня і заданьні заўтра. Гэта дае магчымасьць выявіць прычыны перашкод і дамагчыся лепшай пастаноўкі працы.

У комуне організавалася плянава-опэрацыйная група. Уважліва сочыць затым, каб дэталі своечасова прыбывалі на месца і скарыстоўваліся.

У маі комуна высунула і выканала сустрэчны плян: замест 25 варштатаў выпусьціла 30.

Заўтра мы ўступаем у трэці квартал трэцяга году пяцігодкі. Трымаючы раўненьне на перадавых, і вывучаючы іх вопыт, будзем змагацца за поўнае выкананьне пляпаў, за комсамольскую гасразьліковую брыгаду, за дзесяткі і сотні такіх-жа чырвоназьменаўскіх ударных-комсамольскіх.


І. Гел.

ЦК ЛКСМБ і „Чырвонай Зьмене“

Першы зьлёт рабочае моладзі заводу імя Сталіна, абгаварыўшы контрольныя лічбы на трэці квартал, запэўнівае ЦК ЛКСМБ і яго баявы орган „Чырвоную Зьмену“, што моладзь заводу, якая носіць імя правадыра партыі тав. Сталіна, будзе рашуча змагацца за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну па ўсіх паказчыках.

Моладзь падтрымлівае высунуты комсамолам заводу сустрэчны комсамольскі агрэгат і абавязваецца разам з комсамольскім колектывам змагацца за яго выкананьне.

Прэзыдыум зьлёту.



Ударная комсамольская брыгада Віцебскай акулярнай ф-кі

За рашучую і карэнную перабудову комсамольскай работы

Мы сёньня заканчваем другі квартал і ўступаем у трэці, які зьяўляецца рашаючым кварталам у трэцім, рашаючым годзе пяцігодкі. Кожны дзень гэтага кварталу патрабуе сапраўдных бальшавіцкіх тэмпаў плюс якасьць работы ўсяе рабочае клясы, комуністычнай партыі і комсамолу.

Тэмпы плюс якасьць— наша бальшавіцкая формула

„Комуніст, бальшавік, комсамолец пазнаюцца ў тэмпах і толькі тэмпах плюс якасьць“. Каб дабіцца выкананьня гэтага лёзунгу, кінутага тав. Косаравым з трыбуны IX-га зьезду УсеЛКСМ, мы павінны з усёй рашучасьцю перабудоўваць работу кожнага комсамольскага камітэту, колектыву і цэхячэйкі. Кожны комсамолец у цэху, брыгадзе, саўгасе, колгасе павінен быць пастаўлены на рашаючых і адказьнейшых вучастках нашай будоўлі.

Расстаноўка ўнутраных сіл у групах, на вучастках павінна паслужыць яшчэ большым стымулам у пашырэньні соцыялістычных форм працы (плянава-опэрацыйныя і рацыяналізатарскія групы, сустрэчныя пляны, гаспадарчы разрахунак і г. д.).

Перабудова комсамольскай работы на фабрыцы, заводзе павінна быць падпарадкавана задачам прамфінпляну: барацьба за колькасныя і якасныя паказчыкі, за тэхніку, рацыяналізацыю і г. д.

Цэнтр цяжару—у брыгаду, вучастак

Прыкладам перабудовы комсамольскай работы на вытворчасьці могуць служыць комсамольскія організацыі буйнейшых пролетарскіх цэнтраў.

На буйнейшых заводах гораду Леніна—„Чырвоная зара“ імя Карла Маркса—комсамольскія організацыі дабіліся надзвычайных посьпехаў перабудоваю сваёй працы, якая ў значнай меры садзейнічала таму, што гэтыя заводы выканалі свае пяцігадовыя пляны ў 2 з пал. гады.

Комсамольская работа на гэтых заводах, як і на іншых прадпрыемствах Ленінграда карэнным чынам перабудавана. Цэнтр цяжару работы комсамолу перанесены ў самыя нізавыя зьвеньні: брыгаду, вучастак.

Пры кожнай вытворчай адзінцы-вучастку, брыгадзе—організаваны групы з 5—7 чалавек. Кожная мае свайго групорга, які працуе пад непасрэдным кіраўніцтвам бюро цэх'ячэйкі. Кожны комсамолец мае сваю вытворчую і комсамольскую нагрузку. Кожны комсамолец групы мае сваю функцыю:—адказны за тэхніку, рацыяналізацыю, плянаваньне, вайсковую паліт-выхаваўчую работу, рост і г. д.

Перанясеньне цэнтру цяжару ў групу дае магчымасьць комсамольскай організацыі прыняць найлепшы ўдзел у вытворчасьці. Так, за лік унесеных комсамольцамі прапаноў на заводзе „Чырвоная зара“ з'эканомлены сотні тысяч рублёў, спынен завоз з-за мяжы паасобных частак, машын, тэлефоннай апаратуры і інш.

Вялікую работу праводзяць групы па выкананьню лёзунгу: „100 проц. рабочай моладзі—у комсамол“. Кожная група вядзе вучот беспартыйнай моладзі і сыстэматычную політвыхаваўчую работу па ўцягненьню яе ў комсамол. Кожную пяцідзёнку група дае бюро цэх'ячэйкі зводку аб ходзе росту. Процант ахопу рабочае моладзі комсамолам на гэтых 2-х заводах дасягае 90.

Кожны комсамолец — плянавік цэху. Плянава-опэрацыйныя групы на гэтых заводах у сваю чаргу падзяляюцца на тры падсобныя: 1. забясьпечаньня цэху неабходнай сыравінай. 2. плянаваньня і 3. барацьбы з бракам.

Кожная цэх'ячэйка і кожная група атрымлівае кантрольныя заданьні па рацыяналізатарскім мерапрыемствам. На кожны квартал ячэйка дае кантрольныя заданьні па выназходзтву, рацыяналізацыі і г. д.

Блёк-нот комсамольскага організатара

Кожны групорг мае блёк-нот, у які штодня заносяцца паказчыкі выкананьня тэю ці іншаю групай свайго прамфінпляну, тэхнічнай, вайсковай і агульна-адукацыйнай вучобы, выкананьня кожным комсамольцам і кожным ударнікам свайго прамфінпляну і г. д.

„Блёк-нот організатара“—лепшая форма вучоту ўсёй работы ня толькі групы, але паасобнага комсамольца, кожнага маладога рабочага. Гэтая форма павінна быць падхоплена ўсімі комсамольскімі організацыямі БССР.

Па прыкладу Ленінградзкай організацыі, Менская гарадзкая організацыя таксама распачала перабудову сваёй структуры. У кожным комсамольскім колектыве ствараюцца 5 сэктароў: орг.-інструктарскі, масавы-вытворчы, сэктар культуры і пропаганды, сэктар вайсковай працы і вясковай. Кожны сэктар мае свае поўныя функцыі.

Увядзеньне гэтай новай структуры ў комсамольскай рабоце на вытворчасьці павінна быць цесна ўвязана з выкананьнем прамфінпляну.

Комсамольскія ячэйкі і колектывы фабрык і заводаў, саўгасаў і колгасаў павінны ў часе перавыбараў бюро ячэек па гэтаму прынцыпу перабудоўваць сваю работу.

Мы заклікаем усе організацыі, і асабліва вытворчыя, выказацца на старонках „Чыр. Зьмены“ па пытаньню перабудовы комсамольскай работы, у адпаведнасьці з задачамі выкананьня і перавыкананьня ўсіх паказчыкаў прамфінпляну.

Мы чакаем ад нашых юнкораў, сакратароў комсамольскіх ячэек і колектываў водгуку і адначасова прапаноў ў галіне перабудовы комсамольскай работы.

Х. Б.

5-ты дзень паходу

Няма комсамольскага размаху

Узьняць усю організацыю ў паход

Сёньня 5-ты дзень комсамольскага паходу. З вызначаных 15 тысяч лепшых комсамольцаў, на 30-е чэрвеня мобілізавана толькі 2275 чалавек. Правільны ўлік пачаўся ў 1243 колгасах. Працоўная кніжка даведзена да 2634 колгасьнікаў.

Усе гэтыя тры лічбы—паказчыкі яўна нездавальняючай работы. комсамол мае ўсе магчымасьці даць лічбы геройчных перамог. Для гэтага трэба, каб усе без выключэньня комсамольскія раённыя організацыі і ячэйкі па-ўдарнаму разгарнулі работу мэтодам соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

Мы зараз уступілі ў самы найадказьнейшы пэрыод сельска-гаспадарчых работ. Пасеяна шмат. Трэба захаваць пасеў ад шкоднікаў і сваячасова прыбраць пасеянае.

Дакладная організацыя працы кожнага колгасьніка, улік яе па колькасьці і якасьці будзе рашаць посьпехі ўборкі.

Зараз шырока разгарнулася праполачная кампанія і падрыхтоўка да ўборкі. Паход комсамолу—адно з важнейшых зьвеньняў падрыхтоўкі да ўборачнай, паказчыкі паходу—паказчыкі падрыхтоўкі да ўборкі.

Правядзеньнем паходу ўзмацніць тэмпы праполачнай і падрыхтоўку да ўборкі. Да 10-га ліпеня комсамол БССР павінен выканаць узяты абавязак: давесьці да кожнага колгасьніка працоўную кніжку.

Ня вышлі ў бой з падзёншчынай

Пастановы ЦК УсеЛКСМ і ЛКСМБ аб правядзеньні Усесаюзнай комсамольскай аховы ўраджаю і падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі Сакалішчанская ячэйка не абгаварыла. Праўленьне колгасу і комсамольская ячэйка ня ўзялі ўдарных тэмпаў у падрыхтоўцы да ўборачнай. Уборачныя машыны не праверены і не рамантуюцца.

Праца ў колгасе не організавана. Праполачная кампанія праводзіцца ў большасьці мэтодам падзёншчыны. Не пераведзены ўсе віды работ на зьдзельшчыну, працоўная кніжка не даведзена да кожнага колгасьніка, няма штодзённага ўліку працадзён.

П. Яўг.

Сем комсамольскіх брыгад

Церахаўскі райком комсамолу склаў 7-м комсамольскіх брыгад па падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі. Галоўная задача гэтых брыгад—дапамагчы колгасам падрыхтавацца да ўборкі і разам з комсамольскімі ячэйкамі праверыць стан падрыхтоўкі і організацыі працы ў колгасах. Аднačасова ў кожным колгасе організаваны комсамольскія дазоры па ахове ўраджаю, якія павінны сачыць за зьяўленьнем шкоднікаў і сваячасова даводзіць аб гэтым да ведама—праўленьня колгасу і „Чырвоназьменаўскага“ паста пры райкоме.

Нік.

У паход за зьдзельшчыну, улік

Бешанковічы. 28.—Бешанковіцкая комсамольская організацыя ўключылася ў абвешчаны ЦК паход за правільны улік працадзён у колгасах. Мобілізавана 50 лепшых комсамольцаў, з мобілізаванымі праведзена нарада.

28-га разьехаліся па колгасах.

Хахлоў.

* * *

Шклоў.28—Уключыліся у паход, мобілізавана 50 комсамольцаў. 26-га мобілізаваныя выехалі для работы ў колгасах.

Райкамол

* * *

Горкі. 28—Горацкі райком мобілізаваў 264 комсамольцаў-студэнтаў Акадэміі для наладжваньня правільнага ўліку працадзён у колгасах,

24-га мобілізаваныя выехалі ў колгасы. Будзе абслужана 112 колгасаў.

Райкамол.

Сёньня падаем без комэнтарыяў

Мінула 9 дзён, як абвешчаны комсамольскі паход за правільны ўлік працы ў колгасах. Гарадоцкі, Расонскі, Асіпавіцкі, Бапыльскі, Чашніцкі, Лепельскі, Камарынскі, Мазырскі, Багушэўскі і Сеценскі раёны не даслалі ў цэнтральны штаб зводак аб ўключэньні ў паход аб ліку мобілізаваных комсамольцаў, аб колькасьці колгасаў, якія пачалі правільны ўлік і аб колькасьці колгасьнікаў, да якіх [illegible]дзены працоўныя кніжкі.

Летні агромінімум у пасевах караньплодаў і бульбы

I

Караньплоды

Добра падрыхтаванае і ўгноенае поле пад караньплоды і бульбу яшчэ не дае поўнай гарантыі таму, што будзе атрыманы высокі і добры ўраджай. У час свайго росту гэтыя культуры, асабліва першая, падпадаюць под цэлы шэраг няспрыяючых момантаў іх росту, у выніку чаго можа значна зьніжацца ўраджай і пагаршацца яго якасьць. Без перавялічэньня можна сказаць, што ўраджай караньплодаў на 75 проц. залежыць ад дагляду за імі.

Сучасная тэхніка сельска-гаспадарчай вытворчасьці ўладае цэлым шэрагам сродкаў з дапамогаю якіх можна ўтварыць больш спрыяючыя ўмовы росту караньплодаў у час іх разьвіцьця і тым самым садзейнічаць падвышэньню іх ураджаю і якасьці ў саўгасах і колгасах.

Дагляд за караньплодамі,—як агрономічны мінімум—у летні час складаецца з наступнага:

Калі адразу пасьля засеву караньплодаў бываюць вялікія дажджы, дык узьнікае небясьпека ўтварэньня скарынкі, якая надта перашкаджае узыходам караньплодаў. Утварэньне гэтае скрынкі ні ў якім разе дапусьціць нельга. Як толькі заўважаца, што яна ўтварылася, зараз-жа трэба зрабіць адпаведнае, каб зьнішчыць. Зьнішчаецца яна проста. Калі не зьявіліся яшчэ ўзыходы можна пусьціць у 1-2 сьляды барану, а калі гэта скарынка больш позьняга утварэньня пасьля зьяўленьня узыходу, дык можна пусьціць конны плянэт з грабельнымі працуючымі часткамі.

Тыдні праз два пасьля зьяўленьня ўзыходаў, калі расьліны маюць 4-5 лістоў, неабходна зрабіць першае прарэджваньне расьлін у радкох і аднačасова ўдаляецца і сьмяцёвая расьліннасьць. Прарэджваньне трэба лічыць надзвычайна важнай работай, таму, што калі яго не зрабіць, дык пры густым засеве будзе многа бацьвіньня, але мала караньплодаў,—будуць глушыць адзін другога. Прарываць патрэбна такім чынам, каб у радку расьліна ад расьліны стаяла так на 30-35 см. (буракі, турнэпс, бручка,—а морква—12-20). Пасьля гэтае работы робіцца прарэджваньне буракоў; потым ужо можна рабіць прарэджваньне турнэпсу, бручкі і пазьней за ўсё морквы. Асабліва спяшацца з прарэджваньнем турнэпсу і бручкі нельга таму, што на яе нападая зямляная блыха і толькі тады можна рабіць прарэджваньне, калі лісьце гэтых расьлін стануць агрубелымі і ня будуць баяцца блыхі.

Пасьля прарыўкі неабходна сачыць, каб поле не зарастала сьмяцёвымі травамі і таксама не ўтваралася скарынка. У такіх выпадках па меры патрэбы неабходна пушчаць палольнікі, плянэты і інш. Зараз гэтую опэрацыю з посьпехам можна рабіць пры дапамозе трактарнай цягавай сілы, калі толькі ёсьць трактар сыстэмы „Фармаль“.

Праз тры тыдні пасьля першага прарэджваньня часта неабходна бывае ўтварыць яшчэ адзін раз прарэджваньне. Гэта ўжо зьвязана з лішняй стратай рабочых рук і таму лепш гэта прарэджваньне замяніць адным лішнім рыхленьнем.—Пры гэтым у значнай меры зьнішчаюцца сьмяцёвыя травы і гэта па дадзеных дасьледчых устаноў аплачваецца палвышэньнем ураджаю.

Калі лісты суседніх радкоў злучацца адзін з другім, тады можна ўжо спыніць усялякі дагляд за караньплодамі, апрача толькі выпадкаў зьяўленьня шкоднікаў і хвароб. У гэты час, звычайна, караньплоды настолькі бяруць сілу свайго разьвіцьця, што пачынаюць прыгнятаць сьмяцёвыя травы і толькі адзін асот можа бесхваробна разьвівацца разам з караньплодамі. У выпадках, калі гэтая шкодная трава ёсьць яе неабходна вырываць і не даваць пашырацца на большую плошчу.

Некаторыя з караньплодаў могуць высявацца як насеньнем так і расадай. Лепш за ўсё перасадку пераносяць бручка і буракі, горш турнэпс і морква. Апошняя хоць і прыжываецца добра, але яна надзвычайна пачынае тады куставацца і ўраджай атрымліваецца дрэннай якасьці. Пасадка расады бручкі ўтвараецца такім самым чынам, як пасадка капусты (60 см. рад ад раду і на 30 ст. у радку)

Пасаджаную расаду неабходна наглядаць і, у першую чаргу, яе трэба палівааць вадою на працягу некалькіх дзён,—пакуль яна не прыжывецца. У дажджлівае надвор'е паліўкі многа рабіць ня трэба. У далейшым дагляд за бручкаю, пасаджанай расьлінаю будзе такім самым, як і за бручкай, пасаджанай насеньнем, і выражаецца ў праполцы і абсыпаньні паасобных расьлін пры дапамозе конных ці трактарных рыхліцеляў, палольнікаў, акучнікаў і г. д. Пасьля таго, як лісьце пачынае змыкацца з гэтага часу і да ўборкі ўжо ніякага дагляду не патрэбна.

Уборку караньплодаў можна ўтварыць, калі ніжняе лісьце атагнецца да зямлі і пачне жаўцець. Адрываць лісьце да ўборкі, бязумоўна, нельга—ад гэтага значна зьмяншаецца ўраджай. Трэба памятаць, што як раз у лісьцях і адбываецца ўтварэньне спажыўных матэрый, якія і адкладваюцца потым у корнях.

Прыборка караньплодаў утвараецца спэцыяльнай машынай, альбо з дапамогаю вілак, альбо проста выбіраецца рукамі. Морква можа выкапвацца пры дапамозе плуга.

Караньплоды, выцягнутыя з зямлі. складаюцца ў невялікія кучы каранем унутр і лісьцямі—вонкі, Аднačасова з гэтым адна з брыгад нажом пачынае абразаць лісьце, але так, каб яно не распадалася, а крыху трымалася за тонкі слой мяккай галоўкі. Прыстаўшая глеба ачышчаецца тупым краем нажа, але так, каб не пашкодзіць скурачкі караньплоду і мякаці. Такім чынам ачышчаныя караньплоды складаюцца ў новыя кучы для праветрываньня, а бацьвіньне зараз-жа паступае ў сілосныя ямы для загатоўкі сілосу. Бацьвіньне трэба трымаць як мага чысьцей. Сілос атрыманы ад забруджанага глебай лісьця, значна зьніжаецца ў сваёй якасьці.

Пры пасевах марквы бацьвіньне можна перад уборкай проста скошваць і—звальваць у сілос. Лісьце морквы надзвычайна багата спажыўнымі матэрыямі і з-яго атрымоўвацца добры сілос.

Захаваньне караньплодаў утвараецца альбо проста на полі ў буртох, ямах, траншэях, альбо ў сядзібе, у падвалах.

А. Савельяў

Горадзкая зональная станцыя малочнай гаспадаркі

Комсамолія,—ты ў адказе!

Пролетарскі друк чакае ад цябе баявога папаўненьня комсамольцамі-юнкорамі-ўдарнікамі

Сыгналаў „Чырвонай Зьмены“ аб пагражаючым становішчы мобілізацыі „50“ комсамольцаў—юнкораў-ударнікаў на работу ў райгазэты да сёньняшняга дня не пачулі ў шэрагу райорганізацый КСМ. Мобілізавана ўсяго 27 чалавек.

Менскі, Віцебскі гаркомы ЛКСМБ павінны былі мобілізаваць на гэту работу па 3 чалавекі кожны, але-ж з-за безадказных адносін дадзеная разьвёрстка засталася на паперы.

Так ганебна адносяцца да гэтае мобілізацыі Гомельскі Магілеўскі, Жлобінскі і інш. РК. Гэтыя райкомы ня ўлічылі палітычнай важнасьці і неабходнасьці безадкладнага выкананьня пастаноў ЦК партыі і ЦК комсамолу па узмацненьню апарату нізавога друку сапраўды вытрыманымі, здольнымі, апраўдаўшымі сябе на практычнай рабоце комсамольцамі — юнкорамі-ўдарнікамі.

Згодна апошняй пастановы ЦК пры культпропе ЦК КП(б)Б 4-га ліпеня 1931 г. пачынаюць працаваць месячныя курсы падрыхтоўкі мобілізаваных на працу ў райгазэты. Райкомам і гаркомам ЛКСМБ неабходна мобілізаваць увагу ўсёй організацыі на сваячасовае выкананьне мобілізацыі комсамольцаў у райгазэты, поўнасьцю забясьпечыўшы высунутыя запатрабаваньні і сваячасовую яўку мобілізаваных на курсы.

УСІМ ГК І РК ЛКСМБ

ЦК ЛКСМБ паведамляе, што 4 ліпеня пры сэктары друку ЦК КП(б)Б

ПАЧЫНАЮЦЬ ПРАЦАВАЦЬ

месячныя курсы па падрыхтоўцы мобілізаваных комсамольцаў у лік „50“ на работу ў раённыя газэты.

Тэрмінова камандыруйце вылучаных вамі комсамольцаў на гэтыя курсы. Тым РК, якія ня выканалі разьвёрсткі ЦК, зараз-жа мобілізаваць комсамольцаў адпаведна ранейшых патрабаваньняў і таксама камандыраваць да вызначанага тэрміну на курсы.

Заг. АПТУ ЦК ЛКСМБ ПЕРЛІНА.

Нездавальняючыя тэмпы

Пастаўленая 9-м зьездам УсеЛКСМ задача аб ператварэньні комсамолу ў шматмільённую організацыю Бабруйскай райорганізацыяй далёка ня выканана, У параўнаньні з ростам організацыі ў асобным ударным квартале 1930 года мы маем значнае зьніжэньне тэмпаў росту за апошнія два кварталы 1931 г.

Калі ва ўдарным квартале організацыя вырасла на 410 чалавек, дык за першы квартал 1931 году вырасла толькі на 360, а за другі квартал яшчэ менш—на 340.

Ганебна выконваецца задача 100 проц. ахопу рабочае моладзі комсамолам. На Дрэваапрацоўчым комбінаце працуе больш 1500 чалавек рабочае моладзі, а у комсамоле толькі 655. За апошні квартал колектыў вырас на 78 чалавек.

На швэйнай фабрыцы імя Дзяржынскага працуе звыш 500 чалавек рабочае моладзі, а ў комсамоле ўсяго 300 чалавек.

Такое становішча з ростамі на машынабудаўнічым заводзе імя Сталіна, мэблёвай фабрыцы імя Халтурына і ў іншых вытворчых колектывах гораду.

Рост організацыі за лік перадавое колгаснае моладзі праходзіць таксама марудна. За 9 месяцаў організацыя вырасла толькі на 190 колгасьнікаў. За гэты час лік колгасных ячэек вырас з 17 да 27. А ў раёне налічваецца звыш 100 колгасаў.

Ня лепш справа з ростам за лік саўгаснай моладзі. Так, напрыклад, у саўгасе Дайнічы 50 чалавек рабочае моладзі, а ў комсамоле 18. У саўгасе Жылічы ячэйка ў асноўным расьце толькі за лік вучняў школы саўгасвучу, а не за лік рабочае моладзі.

Рашэньні зьезду аб пагалоўным ахопе фабзавучам комсамолам ня выкананы. Так, ФЗВ мэталістых налічвае 200 фабзайцаў, а ў комсамоле 80—90 чалавек. У школе Дорбудвучу 192 чалавекі і толькі 80 у комсамоле.

Гэтыя марудныя тэмпы ў росьце Бабруйскай комсамольскай організацыі сьведчаць аб тым, што колектывы і ячэйкі не праводзяць належнай масавай палітвыхаваўчай работы сярод беспартыйнай і рабоча-батрацкай саўгаснай моладзі.

Гаспадарча-палітычныя кампаніі недастаткова яшчэ ўвязваюцца з задачамі росту комсамолу. Так, справаздачна-перавыбарчая кампанія бюро ячэек у цэлым радзе колгасаў і прадпрыемстваў раёну ня была ўвязана з ростам комсамолу. Рост не зьяўляецца штодзённай работаю большасьці комсамольскіх колектываў і ячэек.

Рашэньні комсамольскага зьезду аб барацьбе за шматмільённы комсамол не даведзены да шырокіх мас працоўнае моладзі.

Бывае, што заявы аб прыёме ў комсамол залежваюцца ў колектывах, ячэйках па некалькі тыдняў (комбінат швэйнай фабрыкі і інш.).

Абвешчаны Бабруйскім райкомам комсамолу двухдэкаднік праверкі выкананьня рашэньняў IX-га зьезду Усе ЛКСМ па пытаньнях росту—застаўся на паперы і не даў яшчэ належнага зруху ў ліквідацыі азначаных вышэй прарываў.

Хазанаў.

Папраўка

У „Чырвонай зьмене“ ад 26 чэрвеня па тэхнічнаму недагляду выпала у артыкуле „Шлях, на якім не павінен ісьці паэта“ такая канцоўка:

„Глыбей увайдзі ў рабочыя літаратурныя гурткі, дапамай ім краcаваць.

І тады зразумееш пафос барацьбы зразумееш пялізарную організатарскую ролю рабселькораў-„камандзіраў пролетарскай грамадзкай думкі“.

Адказны рэдактар **МІХ. ПЛАТАЎ.**

Друкарня імя тав. Сталіна. Галоўлітбел № 599